ўявіць сабе выкананне сучаснай музыкі падчас літургічнага абраду, таму каталіцкай царквой было дазволена прымяненне такой музыкі ў пазалітургічным абрадзе, не парушаючы традыцый і нормаў літургіі.

---

*1.* Кангрэгацыя абрадаў: Інструкцыя «Musicam sacram» ад 5 сакавіка 1967 г. // арт. 14: AAS 59, p. 305. – 1967. – 104 с.

*2.* Literatura i sztuka: kerygmat [Zasób elektroniczny] // Encyklopedia PWN. – Tryb dostępu: https://encyklopedia.pwn.pl/encyklopedia/kerygmat. – Data dostępu: 10.03.2019.

*3.* Zebrania Plenarne Konferencji Episkopatu Polski od 14 października 2017 r. Komunikat z 377. – Lublin : Wydawnictwo KUL, 2017. – 2 s.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВІРТУАЛЬНЫЯ ПРАЕКТЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БІБЛІЯТЭКІ БЕЛАРУСІ (да Года малой радзімы)

***І. У. Градоўкіна,***
*загадчык аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*

Сучасныя тэхналогіі дазваляюць ствараць якасна новыя рэсурсы, якія комплексна спалучаюць самыя розныя віды інфармацыі. Карыстальнікам прадастаўляецца адзіная кропка доступу як да аўтэнтычных крыніц, так і да разнастайных матэрыялаў, іх аналітыка-сінтэтычнай і навуковай апрацоўкі, значна палягчаецца пошук і аналіз неабходнай інфармацыі.

За апошнія гады ў межах дзейнасці па бібліяграфічным і віртуальным узнаўленні беларускай гісторыка-культурнай спадчыны Нацыянальная бібліятэка Беларусі (НББ) ажыццявіла шэраг цікавых і, думаецца, запатрабаваных навукова-даследчых і выдавецкіх праектаў, якія набылі асаблівую актуальнасць у сувязі з абвяшчэннем Года малой радзімы. Тэмы і ідэі для такіх праектаў часта даюць менавіта тыя матэрыялы, якія назапашваюцца ў ходзе пастаяннай мэтанакіраванай работы па фарміраванню бібліяграфічных, паў-

натэкставых і фактаграфічных рэсурсаў (ЭІР «Нацыянальная бібліяграфія Беларусі», беларусазнаўчыя тэматычныя калекцыі ў электроннай бібліятэцы НББ, БД «Беларусь у асобах і падзеях» і інш.), а рэалізацыя лакальных праектаў, у сваю чаргу, спрыяе змястоўнаму напаўненню і саміх гэтых рэсурсаў новай інфармацыяй. Адначасова мы назіраем і працэсы трансфармацыі традыцыйных бібліятэчных роляў і кампетэнцый. Бібліёграф-практык, які ўдзельнічае ў гэтых праектах, мае магчымасць стаць даследчыкам, генератарам ідэй, набыць навыкі работы з лічбавым кантэнтам, добра арыентавацца ў айчыннай гісторыі і дакументным патоку мінулых стагоддзяў, праявіць свае здольнасці ў наладжванні кантактаў і камунікацый.

Пра ўсе шматлікія віртуальныя праекты НББ расказаць няма магчымасці, таму мэтазгодна спыніцца на некаторых, якія прадстаўляюць рэгіёны Беларусі, іх спадчыну, з’яўляюцца карыснымі для краязнаўчай дзейнасці.

У рамках такіх праектаў ажыццяўляецца не толькі збор лічбавых копій выданняў, але і ствараецца розная дадатковая інфармацыя: хронікі падзей і апісанні персаналій, бібліяграфічныя спісы і агляды, падбіраюцца пры неабходнасці музычныя кампазіцыі, выяўляюцца і сканіруюцца разнастайныя фатаграфіі, карціны, плакаты, паштоўкі і інш. Такі падыход дазваляе шматпланава распрацаваць тэму, рэканструіраваць эпоху, перадаць яе «атмасферу» і, галоўнае, сфармаваць для даследчыкаў якасную крыніцазнаўчую базу.

Падобны рэсурс ствараўся Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі (НББ) на працягу 2010–2014 гг. у рамках навукова-даследчага і выдавецкага праекта, прысвечанага памятным кніжкам беларускіх губерній.

З 2015 г. у НББ ажыццяўляецца работа над шэрагам праектаў у межах прыкладной навукова-даследчай работы (ПНДР) «Віртуальная рэканструкцыя дакументаў і матэрыялаў па рэгіянальнай гісторыі Беларусі», разлічанай да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

канца 2020 г. Аб’ектамі даследаванняў, якія набылі новае гучанне ў Год малой радзімы, з’яўляюцца дакументальныя крыніцы па гісторыі асобных рэгіёнаў і населеных пунктаў, аб дзейнасці знакамітых асоб, устаноў навукі, адукацыі, культуры, іх навуковая і асветніцкая спадчына.

Работу па рэалізацыі гэтых праектаў можна назваць плёнам сумесных намаганняў бібліятэчных, навуковых, адукацыйных, музейных, архіўных устаноў краіны, краязнаўчай супольнасці па ўзнаўленню і папулярызацыі гісторыка-культурнай спадчыны. Сярод нашых партнёраў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, бібліятэка і музей БДСГА, Беларуская сельскагаспадарчая бібліятэка імя І. С. Лупіновіча, Віцебская абласная бібліятэка, Віцебскі абласны краязнаўчы музей, Нацыянальны архіў Беларусі, Брэсцкая абласная бібліятэка, Слонімская раённая бібліятэка. Да супрацоўніцтва далучыўся і шэраг навукоўцаў і краязнаўцаў-аматараў.

Першы з праектаў у рамках ПНДР быў прысвечаны Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі і прымеркаваны да 175-годдзя з часу яе стварэння (2015). У электронным выданні [1] адлюстраваны стагадовы перыяд з гісторыі ўстановы. Адкрытая ў 1840 г. як Горыгорацкая земляробчая школа, пазней ператвораная ў земляробчы інстытут, акадэмія стала першай вышэйшай навучальнай установай аграрнага профілю на беларускіх землях. Больш за тое, на працягу пэўнага адрэзка часу яна наогул была адзінай вышэйшай навучальнай установай Беларусі, з’яўлялася не толькі цэнтрам аграрнай навукі і адукацыі, але і асяроддзем культурнага і літаратурнага жыцця, знаходзілася ў эпіцэнтры розных гістарычных падзей – ваенных, грамадска-палітычных, рэвалюцыйных.

Практычным вынікам наступнага лакальнага праекта з’явілася электроннае выданне «Региональная история Беларуси в документах и материалах Виленской археографиче-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ской комиссии (1864–1915)» [4]. Нягледзячы на тое, што Віленская археаграфічная камісія была створана з пэўнымі ідэалагічнымі мэтамі, на тэндэнцыйнасць яе дзейнасці, яна зрабіла велізарную работу па збору і апублікаванню старажытных дакументаў, значная частка з якіх звязана з рэгіянальнай гісторыяй Беларусі. Выданні Віленскай археаграфічнай камісіі («Акты …», пісцовыя кнігі, зборнікі дакументаў па гісторыі аграрных адносін, лясной гаспадарцы і іншыя матэрыялы) да нашага часу не страцілі сваёй ролі ў якасці найбольш значных актавых пісьмовых крыніц па гісторыі Беларусі і актыўна выкарыстоўваюцца для пошуку інфармацыі сучаснымі даследчыкамі. Старшынямі і членамі Віленскай археаграфічнай камісіі ў розныя гады былі многія вядомыя асобы (гісторыкі, этнографы, археографы, філолагі, літаратары, рэлігійныя дзеячы, выкладчыкі): П. В. Кукальнік, Я. Ф. Галавацкі, Ю. Ф. Крачкоўскі, Н. І. Гарбачэўскі, І. Я. Спрогіс, Ф. М. Дабранскі, А. В. Турцэвіч, Дз. І. Даўгяла і інш.

Кампакт-дыск «Деятельность Витебской ученой архивной комиссии (1909–1919): документы и материалы» [3] прысвечаны навуковай установе, якая была створана па ініцыятыве Е. Р. Раманава, А. П. Сапунова і В. С. Арсеньева. Яе задачамі былі: ахова помнікаў гісторыі і культуры, вывучэнне і папулярызацыя гісторыі Віцебшчыны, збор музейных калекцый, правядзенне археалагічных даследаванняў і раскопак, выяўленне старажытных дакументаў, выданне навуковых і папулярных прац, святкаванне юбілейных дат, арганізацыя экскурсій. Па ініцыятыве камісіі былі адкрыты Віцебскі настаўніцкі інстытут і Віцебскае аддзяленне Маскоўскага археалагічнага інстытута. Нягледзячы на кароткі (дзесяцігадовы) перыяд існавання, Віцебская вучоная архіўная камісія здолела выйсці за афіцыйна прадпісаныя рамкі і стала навуковым, культурным, адукацыйным цэнтрам, вакол якога групавалася мясцовая інтэлігенцыя, а яе выданні сталі своеасаблівымі энцыклапедыямі рэгіянальнай гісторыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Электроннае мультымедыйнае выданне «1000-годдзе Брэста: праз прызму старадаўніх дакументаў» (2019) [2], падрыхтаванае ў супрацоўніцтве з Брэсцкай абласной бібліятэкай і Нацыянальным гістарычным архівам Беларусі, прадстаўляе шырокі дыяпазон гістарычных крыніц і навуковых даследаванняў, якія паказваюць гісторыю Брэста ад яго першага пісьмовага ўпамінання да сярэдзіны XX ст. Гісторыя старажытнага горада адлюстроўваецца разнастайнымі сродкамі: праз гістарычныя дакументы (летапісныя, актавыя, заканадаўчыя), краязнаўчыя матэрыялы XIX – першай паловы XX ст., публікацыі сучасных даследчыкаў, архіўныя матэрыялы; яна прадстаўлена і ў такіх аспектах, як «Выданні брэсцкіх друкарняў», «Брэст у мастацкай літаратуры», «Брэст на малюнках, паштоўках і рэдкіх фотаздымках», «Брэст на картах», «Гістарычныя сімвалы Брэста».

Мультымедыйнае выданне «Слонім і наваколле праз прызму гістарычных дакументаў, паданняў, даследаванняў» [5] дае шырокую гістарычную панараму аднаго з цікавых гарадоў Беларусі. За час работы над праектам былі сабраны (створаны) лічбавыя копіі аўтэнтычных дакументаў па гісторыі Слонімшчыны, выяўлены і падрыхтаваны іншыя суправаджальныя матэрыялы. Усё гэта аб'яднана ў агульны сэнсавы масіў, рэалізавана магчымасць адзінай кропкі доступу да яго праз пошукавыя механізмы мультымедыйнага выдання. Тым самым забяспечана комплекснасць прадстаўлення багатай гісторыі і культурнай спадчыны Слонімскай зямлі.

Названыя мультымедыйныя выданні прызначаны для навукоўцаў, выкладчыкаў, студэнтаў і аспірантаў, краязнаўцаў, бібліятэкараў, супрацоўнікаў музеяў і архіваў, аматараў айчыннай гісторыі. Яны падрыхтаваны па агульным прынцыпе: у адзіным комплексе змяшчаюцца блокі бібліяграфічных, паўнатэкставых, біяграфічных, фактаграфічных, даведачных, навуковых, ілюстрацыйных, інфармацыйна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аналітычных, гістарычных матэрыялаў. Але кожны з кампакт-дыскаў вылучаецца і сваімі асаблівасцямі.

Так, адметнасцю выдання аб Віленскай археаграфічнай камісіі стаў грунтоўны паказальнік тапонімаў (больш за 500 с.), у якім назвы населеных пунктаў і прыродных аб'ектаў з актавых выданняў камісіі прыведзены ў адпаведнасць з сучаснымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі і фізіка-геаграфічнымі найменнямі Рэспублікі Беларусь. Для гэтага праведзена велізарная пошукавая работа, шматлікія зверкі з Нацыянальнай БД аўтарытэтных запісаў, энцыклапедычнымі і даведачнымі выданнямі і г. д.

Для дыска, прысвечанага Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі, спецыяльна распрацаваны схемы, дзе прыводзяцца ведамасная прыналежнасць, усе рэарганізацыі і перанайменні вучэбнай установы ў розныя перыяды.

Найбольш разнастайныя матэрыялы падрыхтаваны для выдання аб дзейнасці Віцебскай вучонай архіўнай камісіі. Акрамя асноўнага блоку матэрыялаў, тут прадстаўлены асноўныя вехі гісторыі, структурны склад камісіі, даведкі пра бібліятэку, музей, архіў, камітэты, іншыя падраздзяленні ўстановы і г. д. Значнае месца тут займае біяграфічны раздзел, у якім змешчана інфармацыя пра ўсіх персон, звязаных з дзейнасцю ўстановы (а гэта амаль 500 чалавек), у т. л. стараліся адшукаць хаця б кароткую інфармацыю пра недастаткова вядомых у наш час асоб. У выданні змешчаны таксама фотаздымкі музейных экспанатаў з фондаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, копіі архіўных дакументаў і іншыя цікавыя матэрыялы. Была таксама праведзена работа па выяўленню ў фондах НББ асобнікаў, што належалі да збораў бібліятэкі ВВАК (яна, як вядома, была адной з багатых для свайго часу).

Калі гаварыць аб праекце да 1000-годдзя Брэста, то ў ім адзін з найбольш значных інфармацыйных блокаў прысвечаны гісторыі брэсцкага кнігадрукавання. Складальнікам уда-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

лося сабраць у адным масіве звесткі пра выдавецкую прадукцыю брэсцкіх друкароў амаль за пяць стагоддзяў і тым самым зрабіць цэласнае ўяўленне аб дакументнай спадчыне горада і прадставіць яе ў агульнанацыянальным кантэксце. Матэрыялы пра брэсцкую друкаваную прадукцыю згрупіраваны наступным чынам: выданні XVI–XVIII стст., XIX – пачатку XX ст., міжваеннага часу (1919–1939).

У выданні, прысвечаным Слонімшчыне, больш шырока, чым у папярэдніх, выкарыстоўваюцца магчымасці інтэрактыўнага пошуку. Так, напрыклад, ад хронікі гістарычных падзей даюцца спасылкі на розныя дадатковыя матэрыялы (даведачныя матэрыялы, карты, паштоўкі, партрэты і інш.), якія наглядна ілюструюць гэтыя падзеі; ад паказальніка слонімскіх тапонімаў ёсць шэраг адсылак на адпаведныя гістарычныя дакументы з «Актаў Віленскай археаграфічнай камісіі».

У цяперашні час вядзецца праца над праектам, прысвечаным гісторыі Навагрудка. На 2020 г. прадугледжваецца работа па наступных тэмах: «Беларускія гарады і мястэчкі ў гісторыка-краязнаўчых выданнях XIX – пачатку XX ст.», «Дакументы і матэрыялы аб адукацыйных установах Беларусі XIX ст. ».

Да 80-годдзя ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР на інтэрнэт-партале НББ падрыхтаваны віртуальны праект, прысвечаны літаратурна-мастацкім часопісам 1920–1930-х гг., што выходзілі як на тэрыторыі Савецкай Беларусі, так і на заходнебеларускіх землях.

Папулярызацыя гісторыка-краязнаўчых праектаў і інфармацыйнай спадчыны рэгіёнаў у апошні час актыўна ажыццяўляецца на навуковых і сацыякультурных мерапрыемствах рознага ўзроўню. Так, віцебскаму рэгіёну ў 2018 г. былі прысвечаны мерапрыемствы «Інфармацыйныя скарбы зямлі беларускай. Віцебшчына» (НББ) і круглы стол «Нацыянальныя інфармацыйныя рэсурсы: Віцебшчына ўчора і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сёння» (Віцебская абласная бібліятэка). Электроннае выданне, прысвечанае Слонімскаму краю, прэзентавалася ў рамках Дня беларускага пісьменства (Слонім, 1 верасня 2019 г.). Цэнтральнай падзеяй Рэспубліканскага круглага стала «Брэст. 1000 гадоў гісторыі ў дакументах і матэрыялах» (Брэсцкая абласная бібліятэка) стала прэзентацыя юбілейнага мультымедыйнага выдання.

Работа над беларусазнаўчымі і краязнаўчымі праектамі ў НББ будзе працягвацца, таму бібліятэка гатова да далейшага плённага супрацоўніцтва і аб'яднання намаганняў усіх зацікаўленых.

---


*1.* 100 год з гісторыі Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі: дакументы і матэрыялы 1840–1940 гг. [Электронны рэсурс] : да 175-годдзя з дня адкрыцця / Нац. б-ка Беларусі [і інш.] ; навук. рэд. Т. В. Кузьмініч. – Мінск : НББ, 2015. – 1 электр. аптычны дыск (CD-ROM) : каляр.

*2.* 1000-годдзе Брэста: праз прызму старадаўніх дакументаў [Электронны рэсурс] / Нац. б-ка Беларусі [і інш.] ; навук. рэд. Т. В. Кузьмініч. – Мінск : НББ, 2019. – 1 электр. аптычны дыск (DVD-R) : каляр.

*3.* Деятельность Витебской ученой архивной комиссии (1909–1919): документы и материалы [Электронный ресурс] / Нац. б-ка Беларуси [и др.] ; под науч. ред. Т. В. Кузьминич. – Минск : НББ, 2017. – 1 электр. оптич. диск (DVD-R) : цв.

*4.* Региональная история Беларуси в документах и материалах Виленской археографической комиссии (1864–1915) [Электронный ресурс] / Нац. б-ка Беларуси, Фонд «Русский мир» ; под науч. ред. Т. В. Кузьминич. – Минск : НББ, 2017. – 1 электр. оптич. диск (DVD-R) : цв.

*5.* Слонім і наваколле праз прызму гістарычных дакументаў, паданняў, даследаванняў [Электронны рэсурс] / Нац. б-ка Беларусі, Слонім. цэнтр. раён. б-ка імя Якуба Коласа ; навук. рэд. Т. В. Кузьмініч. – Мінск : НББ, 2019. – 1 электр. аптычны дыск (DVD-R) : каляр.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ